каму грамадскаму ўздзеянню публіцыстыкі Я. Коласа перыяду Вялікай Айчыннай вайны.

**Крыніцы**

Віцебскі рабочы. 1942. 21 ліп.

Колас Якуб . 36. тв.: У 14 т. Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы. Мн., 1976. Т. 11.

Паступіў у рэдакцыю 25.04.05.

*Жанна Яўгенаўна Белакурская* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры сучаснай беларускай мовы.

*Р.В. АНАНЬЕЎ, П.Л. ДАРАШЧОНАК*

# МАЛАДЗЁЖНАЯ ПАЛІТЫКА Ў АКУПІРАВАНАЙ БЕЛАРУСІ ЯК СФЕРА ПРОЦІБОРСТВА САВЕЦКІХ ВЫДАННЯЎ І ПРЭСЫ КАЛАБАРАЦЫЯНІСТАЎ

Рассматриваются методы идейной борьбы советской публицистики военного времени с пропагандистскими маневрами нацистской пропаганды и прессы коллаборационистов по привлечению белорусской молодежи к сотрудничеству с оккупационными властями и участию в профашистских организациях.

The article is devoted to the methods of ideological struggle during World War II with nazi and their satellites propaganda against involving Belarusian youth in collaboration with German administration and participation in fascists organizations on the occupied territories.

У гады Вялікай Айчыннай вайны палітычнае супрацьстаянне Савецкага Саюза і Германіі закранала амаль усе бакі жыцця на акупіраваных тэрыторыях, у ліку якіх з верасня 1941 г. апынулася І Беларусь. Сутыкнуўшыся з глыбокай верай пераважнай большасці насельніцтва рэспублікі-партызанкі ў каштоўнасць савецкага ладу жыцця і справядлівы характар усіх форм барацьбы за вызваленне ад нацысцкага рабства, нямецкая прапагандысцкая машына, нягледзячы на рэзкі кантраст паміж фальшывымі лозунгамі і рэчаіснасцю, разгарнула масіраваную прапаганду «новага парадку» ў акупацыйных і калабарацыянісцкіх выданнях. У першы год вайны маладзёжная палітыка Трэцяга рэйха на беларускай зямлі не выходзіла з рэчышча мерапрыемстваў, сумесных са здрадніцкімі арганізацыямі, і толькі 3 ліпеня 1942 г. А. Розенберг выдаў дэкрэт аб стварэнні маладзёжнага аддзела ў падпарадкаваным яму міністэрстве на акупіраваных усходніх землях.

Генеральныя камісары ў Эстоніі і Латвіі падтрымалі стварэнне ў сябе краявых маладзёжных арганізацый (Туронак 1993, 134), а камісар В. Кубэ дабіваўся дазволу на ўтварэнне агульнакраявой маладзёжнай арганізацыі яшчэ некалькі месяцаў, бо дэкрэт аб увядзенні аддзелаў па рабоце з моладдзю на Беларусь і Украіну не распаўсюджваўся, а значыць, не мелася рашэння і на дзейнасць адпаведных саюзаў. Прадстаўнікі Генеральнага камісарыята Беларусі ў лютым 1943 г. заяўлялі пра неабходнасць стварэння ў краі якой-небудзь маладзёжнай арганізацыі: «Мы абавязаны выкарыстаць беларускую моладзь як рэзерв вайны... Гэта павінна быць зроблена з дапамогай асобнай арганізацыі, якую фюрэр даруе беларускай моладзі. Гэта наша дабрачыннасць будзе ўзнагароджана ў сто разоў. Мы павінны прабудзіць у беларускім народзе нацыянальныя пачуцці, паколькі гэта будзе дапамагаць нашай перамозе» (Каваленя 1999. 187).

У першай палове 1943 г. на Беларусі актыўна вялася падрыхтоўка да стварэння Саюза беларускай моладзі (СБМ) - распрацоўваўся статут, пісаліся прапагандысцкія матэрыялы, ішла вучоба акруговых кіраўнікоў, дзейнічалі навучальныя цэнтры - у Альберціне (для хлопцаў) і Драздах каля Мінска (для дзяўчат). У ліпені з'явіліся і друкаваныя органы СБМ - штомесячнік «Жыве Беларусь», вучэбна-інструкцыйныя «Вучэбны лісток» і «Дзённік загадаў». Кіраўнік палітычнага аддзела Генеральнага камісарыята Беларусі Мірш адзначаў: «У шырокіх масах насельніцтва папулярнасць і слава УЛКСМ вельмі вялікая. Моладзь у цяперашні момант ці пасіўна ставіцца да нас, ці наогул нас адмаўляе... І мы цяпер нарэшце павінны што-небудзь рабіць, каб гэту моладзь перацягнуць на свой бок» (Ивлев, Юденков 1988, 200).

«Беларуская газэта»* з першых крокаў падрабязна асвятляла дзейнасць СБМ, за чэрвень - снежань 1943 г. на яе старонках з'явіліся больш за трыццаць публікацый на маладзёжную тэму. Калабарацыянісцка-фашысцкая прапаганда, арыентаваная на падман і занявольванне маладых беларусаў, не шкадавала эпітэтаў і гучных слоў для прыцягнення моладзі ў свой саюз. «Вы павінны стаць жаўнерамі Новае Еўропы, - звяртаўся В. Кубэ са старонак «Беларускай газэты» да беларускіх хлопцаў і дзяўчат, - а не заставацца нявольнікамі жыдоў ды камуністых. Вы павінны дапамагчы ачысціць Вашу радзіму ад чырвонага бандытызму і гэтым здабыць права на родную зямлю» (Беларуская газэта 1943). Шэф кіраўнічага штаба СБМ М. Ганько і галоўны рэдактар «Беларускай газэты» У. Казлоўскі ў сваіх публікацыях малявалі перад прадстаўнікамі беларускай моладзі перспектывы «светлага заўтра побач із моладзяй усіх адроджаных народаў Эўропы» (Казлоўскі 1943).

Дзейнасць СБМ з першых жа дзён знаходзілася пад кантролем аддзела моладзі Генеральнага камісарыята Беларусі. Новаспечаны статут СБМ ставіў заданы «вызваліць беларускую моладзь ад варожых і шкодных уплываў, адрадзіць яе маральна і ўзгадаваць у дусе новай Беларусі пад новым правадырствам нацыянал-сацыялістычнае Нямеччыны», рэкамендаваў весці «нацыянальна-патрыятычнае ўзгадаванне праз азнаямленне з мінуўшчынаю беларускага народу й краю, вывучэнне роднае беларускае мовы й культуры», бачыў сваёй мэтай «выжыць у народзе нявольніцкую псыхіку» і развіць такія рысы душы і характару, «каб беларускі народ, які мае чыста арыйскае паходжаньне, можна было з годнасцяй прыняць у сфэру эўрапейскае культуры». Дбалі нацысцкія ідэолагі і пра тое, каб «выпрацаваць тып фізычна дужага працаздольнага й жыццярадаснага беларускага юнака й здаровае беларускае дзяўчыны, якая ў будучыні павінна стаць высокамаральнаю жонкаю і добраю маткай». Была ў планах і яшчэ адна жудасная перспектыва - «даць беларускай моладзі магчымасць звярнуць свой погляд да невычарпальных багаццяў двутысячагоднай арыйскай культуры й пазнаць мінуўшчыну свайго народу й ягонага жыццёвага прастору» (Беларуская газэта 1943).

Публіцысты савецкіх выданняў рашуча абвяргалі нацысцкую хлусню, падтрымлівалі веру народа ў сваю Радзіму, свае ідэалы. У № 45 газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» за 1942 г. цэлая старонка прысвячалася жудасным злачынствам гітлераўцаў на беларускай зямлі. Пад шапкай «Смерць і праклядце дзетазабойцам!» былі змешчаны пяць фотаздымкаў, якія суправаджаў тэкставы матэрыял: «Таварыш! Углядзіся ў першы здымак. Няхай мацней бурліць у тваім сэрцы нянавісць. Фашысцкія каты з жахлівым халоднакроўем забілі і замучылі дзяцей і іх матак. Углядзіцеся ў другі здымак. Віця Чаравічны гуляў з голубам. Фашысцкая куля спыніла жыццё і Віці, і голуба (трэці здымак). Вось тут быў дом, дзеці гулялі, весяліліся, іх лашчыла любоў маці і яе клопаты, а вось яны перад папялішчам, без хаты. На чацвёртым здымку мы бачым, як фашысты спалілі вёску датла. У руках маці забітае фашыстам дзіця. Маці заклікае да пометы (пяты здымак). Дзеці гомельчан вучыліся тут І смела глядзелі ў сваё будучае. На апошнім здымку спаленая немцамі школа ў Гомелі». На гэтай жа старонцы расказвалася пра жорсткасць і здзекі акупантаў у шэрагу беларускіх гарадоў і пасёлкаў: «У г. Петрыкаве немцы расстралялі большую частку жыхароў, а дзяцей жывымі патапілі ў рэчцы. У Ельску немцы пасадзілі на баржу больш 500 жанчын і дзяцей, шэсць дзён вазілі іх галоднымі, а затым утапілі У Суражы немцы загналі 700 чалавек у замініраваны роў. Тых, якія ўцалелі пасля разрыва мін, яны расстралялі з аўтаматаў. У Шклове немцы расстралялі 6000 мужчын і жанчын, а дзяцей жывымі кінулі ў ямы разам з забітымі бацькамі і закідалі зямлёй. Тры дні над магіламі варушылася зямля - жывымі закопаныя дзеці паміралі ў страшных мучэннях» (Раздавім фашысцкую гадзіну 1942).

На старонках газеты «За свабодную Беларусь» 18 кастрычніка 1942 г. быў надрукаваны артыкул «Злачынствы фашыстаў у акупіраваных раёнах», дзе рас-

* У назвах перыядычных выданняў і ў цытатах захоўваецца арфаграфія арыгіналаў адпаведнага часу.

казвалася, як на самай справе навязваецца «новы парадак»: «Метадамі дзікага гвалту праводзіцца анямечванне акупіраваных раёнаў... Яны зганяюць дзяцей, жанчын і старых на цяжкія прымусовыя работы... Яны ўжываюць таксама найлюцейшы тэрор, расстрэлы, катаванні I кары». Я. Колас пісаў 24 красавіка 1943 г. у газеце «Савецкая Беларусь»: «Усе патугі нямецкіх ашуканцаў скіраваны ў адзін бок, нацэлены на адзін пункт: давесці, што фашысцкі "новы парадак" ёсць самы дасканалы на свеце. Свайго цірольскага яфрэйтара, шпіка і душагуба Гітлера яны абярнулі ў новага месіяша і не шкадуюць сваіх языкоў, каб вылізаць бруд сусветнага бандыта і машэнніка» (Я. Колас 1943).

Ствараемы ў Беларусі СБМ будаваўся па прынцыпу дзеючай у фашысцкай Германіі арганізацыі «Гітлераўская моладзь» (Гітлерюгенд), трымаючы стратэгічны курс на выхаванне ўсяго грамадства ў рэчышчы сваіх праграмных ідэй. Перад пачаткам 1943/44 навучальнага года наладжваліся экскурсіі актывістаў СБМ у Германію, каб беларуская моладзь пазнаёмілася з метадамі арганізацыйнай працы Гітлерюгенда, кіраўнікі якога выдзелілі сродкі на танную форму для сяброў СБМ (гл. Туронак 1993, 136).

Уласная уніформа і эмблема, палітычная адукацыя, культурна-асветніцкая дзейнасць, вайсковая муштра, каманды, лагеры і беларускія вайсковыя маршы - усё гэта павінна было прыцягнуць у СБМ, па меркаванні яго лідэраў, шматлікіх прадстаўнікоў беларускай моладзі. Важная роля ў справе папулярызацыі дзейнасці саюза адводзілася калабарацыянісцкаму друку. «Беларуская газэта» на сваіх старонках дала падрабязную справаздачу аб тым, як члены саюза прымалі так званае «забабвязванне» над магіламі нямецкіх ваенных на ўсходнім баку шашы Мінск - Смаленск: «На магілах нямецкіх герояў мы прысягаем, што будзем змагацца з усіх сілаў, пакуль ня будзе пераможаны бальшавізм. Будзем працаваць і змагацца за нашую Бацькаўшчыну і за новую Эўропу» (Беларуская газэта 1943).

Магчымае пашырэнне ўплыву СБМ на беларускую моладзь непакоіла кіраўнікоў партызанскага руху ў Беларусі. Перад падпольнымі абкомамі і райкомамі партыі ставілася задача - не дапусціць колькаснага росту саюза і атручвання нацысцкай ідэалогіяй падлеткаў і моладзі на акупіраваных тэрыторыях. Падпольныя і партызанскія газеты і часопісы разгарнулі шырокую контрпрапаганду, з'едліва высмейвалі сімволіку саюза, экскурсіі ў Трэці рэйх і іншыя мерапрыемствы СБМ. Кіраўнікі савецкага падполля даводзілі да ведама беларускага насельніцтва, што фашысты жадаюць фізічна знішчыць моладзь, якая вядзе барацьбу з акупантамі, сфарміраваць за лік беларускіх хлопцаў і дзяўчат рэзервы працоўнай сілы для далейшага вывазу на работу ў Германію, выкарыстоўваць «сэбээмаўцаў» у барацьбе з партызанамі (Хухлындзіна 1989, 65). Змагацца з новай ініцыятывай гітлераўцаў было вельмі няпроста па прычыне малалецтва яго ўдзельнікаў, да таго ж СБМ вёў актыўную працу пераважна ў вялікіх гарадах і мястэчках, куды партызанам было нялёгка дастувіцца. Таму важнае месца ў выкрыцці правакацыйных планаў кіраўнікоў саюза адводзілася друкаваным перыядычным выданням, лістоўкам. Дзейсным сродкам быў паказ на прыкпадзе канкрэтных фактаў духоўнай апустошанасці і цынізму гітлераўскіх бандытаў, іх бязлітасных адносін не толькі да дарослых, але і да дзяцей: «Азвярэлыя фашысты на сваім шляху знішчаюць усё - забіваюць ні ў чым не вінаватых старых і дзяцей, паляць вёскі, уганяюць жывёлу», - пісаў на старонках газеты «Калгасная праўда» адзін з відавочцаў фашысцкіх злачынстваў. Аўтар публікацыі расказаў пра здзекі гітлераўцаў над насельніцтвам вёсак Замошша, Паротна, Ізафатава, Лясіны, Зартбоўшчына, што на Лепельшчыне: «Як драпежныя звяры, яны ўчынілі расправу над жыхарамі, не паспеўшымі ўцячы з вёскі Зазер'е М-Доліцкага с/с. У першую чаргу нямецкія садысты згвалтавалі жанчын, нават 50-60 гадовых бабуль. Пасля гэтага ўсіх сагналі ў адну хату і на працягу двух сутак здзекваліся, прымяняючы розныя катаванні. Нават хворых жанчын, якія не мелі магчымасць устаць з ложка, яны спачатку білі жалезнымі палкамі, паролі кінжаламі, выкручвалі рукі, выколвалі вочы і несмяртэльна прыстрэльвалі, радуючыся іх пакутам. Так былі замучаны 75-гадовая Зянюк Агрыпіна, Сядлецкая М. і іншыя. Усяго ў гэтай вёсцы было зверскі забіта 5 жанчын і адна 9-гадовая дзяўчынка» (Калгасная праўда 1943).

Навязаць уласныя цемрашальскія ідэі аб вызваленчай місіі немцаў і шчаслівым «новым парадку» на Беларусі нацысцкія прапагандысты імкнуліся, спекулюючы на нацыянальных пачуццях беларусаў, хібах сталінскай палітыкі. Калабарацыяністы вялі адкрытую ці завуаліраваную прапаганду нацысцкіх ідэй у матэрыялах розных кірункаў: культура, адраджэнне, маладзёжнае жыццё. Зацікавіць і перацягнуць на свой бок моладзь, падтрымка якой у далейшай палітычнай барацьбе з цягам часу набудзе вельмі значнае месца, - гэтай канчатковай мэце служылі не толькі прапагандысцкія артыкулы пра дзейнасць СБМ, але і публікацыі, дзе паказвалася, як ледзь не з бацькоўскай стараннасцю гітлераўцы пякуцца аб беларускіх дзецях. Артыкул «Открытие детского дома Союзом борьбы против большевизма» сведчыў, што гэта не першы дзіцячы дом на рахунку дадзенай арганізацыі. Пасля апісання таго, як утульна і прыгожа ў яго пакоях, прыводзіўся тэкст выступления прадстаўніка гарадской адміністрацыі Меншагіна. Звяртаючыся да дзяцей, бацькоў якіх забілі немцы, ён адзначыў: «Многія з вас пазбаўлены сваіх родных, але вы знойдзеце тут бацькоўскую ласку і клопат. Тыя, хто старэйшы ўзростам, ведаюць, што пра дзяцей у Савецкім Саюзе ніхто не клапаціўся, яны жывуць у закануpках, бадзяюцца ў лахманах, спяць пад плотам» (Речь 1944).

Хлусню нямецкіх паслугачоў пра шчаслівы лёс дзяцей-сірот з канкрэтнымі фактамі ў руках пераканаўча абвяргалі беларускія савецкія публіцысты. 12 кастрычніка 1942 г. газета «За свабодную Беларусь» надрукавала матэрыял «Забойцы дзяцей», дзе, у прыватнасці, гаварылася: «Нямецкія бандыты адабралі ў беларускіх дзяцей бацькоў, пазбавілі іх жылля і хлеба, а цяпер твораць новыя злачынствы. 27 верасня эсэсаўцы наладзілі ў Мінску аблаву на беспрытульнікаў. Каля вакзала і ў руінах дамоў гітлераўцы затрымалі каля 100 беспрытульных дзяцей і расстралялі» (За свабодную Беларусь 1942).

Выданне Асіповіцкага падпольнага райкома партыі «За Советскую Родину» ў красавіку 1943 г. змясціла матэрыял «Гитлеровская "любовь" к детям»: «Фашысцкія пісакі ў сваіх часопісах і газетах усяляк расхвальваюць перад савецкігуіі людзьмі "любоў і ўвагу" свайго обер-бандыта Гітлера да дзяцей. Але кожнаму разумнаму чалавеку зразумела і бачна, якая гэта брахня. Брахня, якой яшчэ не чуў свет. Гітлер - гэта драпежны звер у выглядзе чалавека. Ён праяўляе такую "любоў і ўвагу" да дзяцей, што пры першай думцы пра гэта прабягае па скуры мароз і стыне ў жылах кроў. Магчыма ад такой "любові" гітлераўскія ланцужныя сабакі нядаўна ў шэрагу вёсак нашага і Чэрвеньскага раёнаў на вачах у сваіх бацькоў пазверску расстралялі, кінулі жывымі ў агонь і калодзежы каля 800 ні ў чым не вінаватых, несвядомых дзетак. А колькі іх, па волі Гітлера, засталося без даху над галавой і бацькоў? Колькі пазбаўлена магчымасці вучобы і чалавечага выхавання? Мільёны! Вось гэта ў фашыстаў называецца "любоў" да дзяцей. Усё гэта патрэбна Гітлеру для будаўніцтва "новага парадку"» (За Советскую Родину 1943).

Абяцанні шчаслівай будучыні «без яўрэяў і бальшавікоў», распальванне варожых адносін да савецкай улады і антысемітызм мелі месца ў публікацыях практычна кожнага нумара калабарацыяніcцкіх выданняў. Скіраваць падлеткаў на поўную адсутнасць такіх паняццяў, як гуманізм, дабрыня, пяшчота, адданасць, магло стварэнне падручнікаў і праграм выкладання па нацысцкаму ўзору, а перавод «народных школ» на лацінскі алфавіт з чэрвеня 1942 г. сведчыў аб мэтанакіраванай праграме анямечвання беларускай моладзі. Да таго ж прафашысцкая сістэма адукацыі, дзе большасць часу адводзілася на вывучэнне нямецкай мовы, не дазваляла дзецям атрымліваць веды вышэй за ўзровень чатырох кпасаў і вяла да сапраўднага знішчэння адукацыі на Беларусі, стварэння малаадукаванага работніка, які б без лішніх разважанняў мацаваў уласнай працай дабрабыт Трэцяга рэйха. Адной з пастаянных тэм нацысцкай прапаганды з'яўлася вярбоўка на работу ў Германію. Нямецкім уладам у другой палове вайны катастрафічна не хапала таннай працоўнай сілы, на плечы якой можна было б ускпасці самую цяжкую працу пры мінімальных затратах. Перспектыва паехаць на працу ў Трэці рэйх не вабіла маладых насельнікаў краю, таму калабарацыяніcцкія выданні ўсяляк агітавалі іх, друкуючы пісьмы беларусаў з нямеччыны. Беларускія публіцысты выкарыстоўвалі гэты ж метад, але ўжо для

таго, каб паказаць пакуты, якія цярпелі людзі на катаржнай працы. Толькі ў нейкіх выключных выпадках жыццё ў мілітарысцкай Германіі магло аказацца больш-менш цярпімым, большасць жа беларусаў (за гады вайны было сагнана на прымусовую працу больш за 380 тысяч нашых суайчыннікаў) цярпелі здзекі і катаванні, выкарыстоўваліся на самых цяжкіх і малакваліфікаваных работах.

Газета «Партизанская правда» Ільянскага райкома партыі і Н-скага партызанскага атрада ў артыкуле «В тисках смерти» расказвала сваім чытачам пра рэзкія кантрасты паміж прыгожымі рэкламнымі лозунгамі, фальшыва ілюстраванымі фотаздымкамі нямецкіх часопісаў і газет, ілжыва сфабрыкаванымі пісьмамі і рэальным становішчам спраў - голадам, слязамі, смуткам, трывогай за заўтрашні дзень у людзей, сагнаных у Германію. «Усё часцей і часцей нясуцца з Германіі стогны нашых людзей, якія душацца ад пакут у фашысцкім рабстве». І, зразумела, немцы павялі рашучую барацьбу з распаўсюджвальнікамі «драных» вестак... Так, у лістку «Голас вёскі» ад 31 сакавіка 1944 г. (выдавецтва газеты «Белорусский селянин») з'яўляецца заметка пад загалоўкам: «Майстры распаўсюджвання чутак выяўлены». Работніца Марыя Саўкіна Старобінскага сельсавета Слуцкай вобл, піша на радзіму: «Я пакуль што жыва і здарова, працую на фабрыцы. Праца ўсякая: лёгкая і цяжкая. На снеданне атрымліваем 200 гр. хлеба і каву, на абед рэдкую зупу і ўвечары 200 гр. хлеба і зноў рэдкую зупу...» Алёшка са Слуцкага сельсавета піша свайму дзядулю: «...прышлі мне што-небудзь з ежы, бо дрэнна харчуемся». Немцы навялі следства і «выявілі», што Марыя Саўкіна «нахлусіла», так як «яна запраўды атрымлівае куды больш, дык яна сама гэта тады прызнала», а Алёшка нібыта «прызнаўся, што ён схлусіў, ён сваё становішча дрэнна абмаляваў з мэтай, каб ад свайго дзеда атрымаць пасылку. Ён абяцаў не пісаць больш такіх хлуслівых лістоў». Так немцы душаць голас праўды, - падводзіў вынікі канфліктнай сітуацыі аўтар «Партизанской правды». - І тое, што дзяўчына паскардзілася ў пісьме пра сваё горкае жыццё, а Алёшка прасіў дзядулю выратаваць яго ад галоднай смерці, не пройдзе, канешне, дарма... Можна верыць, што Марыя Саўкіна І Алёшка не будуць «пісаць такіх хлуслівых лістоў». Немцы бязлітасна знішчаюць людзей, якія сказалі'праўду пра іх страшнае жыццё ў фашысцкай Германіі...» (Партизанская правда 1944).

Підпольны і партызанскі друк паведамляў пра тое, як мясцовыя ваенныя адміністратары пад выглядам адпраўкі ў Германію занявольвалі моладзь для прымусовай працы. У «Віцебскім рабочым» была апублікавана заметка «Вярбоўка ў... палон»: «У Сенненскім раёне фашысты "навербавалі" каля 30 чалавек моладзі для работы на прадпрыемствах Германіі. Яны наабяцалі "завербаваным" атрыманне высокай кваліфікацыі, поўнае забеспячэнне іх сем'яў, высокую аплату працы і так далей. Але, адвёзшы іх у бок Смаленска, аб'явілі ваеннапалоннымі, заключылі ў лагер і прымусілі працаваць на земляных работах без харчу, адзення пад наглядам нямецкіх салдат з гумавымі палкамі. Аб гэтым факце нам паведамілі таварышы Канстанцін Г. і Віктар Н., якім удалося ўцячы з лагера» (Віцебскі рабочы 1942).

Калабарацыянісцкія газеты дарэмна запэўнівалі сваіх чытачоў, што іх работа на германскіх заводах і фабрыках, у сельскай гаспадарцы мае выключнае значэнне, што ў Германіі ім гарантуюцца гуманныя адносіны, устаноўлены законам рабочы час, зручнае І чыстае жыллё, забеспячэнне па нормах мясцовага грамадзянскага насельніцтва, бясплатная медыцынская дапамога. Абяцанні засталіся абяцаннямі, нягледзячы на бясконцую колькасць нібыта радасных пісьмаў з квітнеючай, добрай Германіі, рэальнае становішча нашых суайчыннікаў, сагнаных у Трэці рэйх, зусім не адпавядала глянцу рэкламных плакатаў. Газета «Минский большевик» 17 снежня 1943 г. надрукавала артыкул «Спасайтесь от угона в немецкое рабство», дзе папярэджвала людзей, рто немцы ладзяць аблавы і карныя экспедыцыі з мэтай дэпартацыі ў Германію, расказвала пра цяжкія ўмовы катаржнай працы.

Лісты з чужыны, што станавіліся ў гады вайны магутным сродкам барацьбы супраць хлусні нацысцкіх наймітаў, друкаваліся і на старонках газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Пад шапкай «Нямецкая няволя горш за

смерць» у № 9 гэтага сатырычнага выдання (май 1943 г.) надрукаваны два пісьмы з Германіі. Першае - «Наша жыццё горш, чым у сабак», - распавядала аб тым, як жывецца і працуецца ў Германіі беларускай дзяўчыне. Галодныя, босыя, амаль без вопраткі, жывуць яны ў летніх бараках, працуюць па 12 гадзін у дзень і не спадзяюцца ўжо выжыць. Другое пісьмо, надрукаванае пад загалоўкам «Вырвіце мяне з лап смерці на чужыне», сведчыць пра лютае абыходжанне нямецкіх гаспадароў з тымі, хто на іх працаваў. Амаль у кожным радку пісьма дзяўчына расказвае пра смерць і пакуты сяброўак. У апошнім радку яна звяртаецца да сваіх братоў: «Ой, як цяжка I балюча мне, родныя мае! Вырвіце мяне, родныя браты, з лап смерці на чужыне».

Лісты людзей з фашысцкага палону, узрошчаныя на пакутах, заклікалі на барацьбу. А праўдзівае слова, надрукаванае на старонках савецкіх выданняў, натхняла чытачоў, і ў першую чаргу - моладзь Беларусі, на бязлітасную барацьбу з ворагам. Лістоўкі і падпольныя газеты траплялі нават на нямецкія прадпрыемствы, пра што сведчыць заметка ў майскім нумары «Белостокской правды» за 1944 г.: «Мне пашчасціла пазнаёміцца з рашэннямі Тэгеранскай канферэнцыяй трох дзяржаў. Гэтыя гістарычныя дакументы ўмацавалі маю ўпэўненасць у хуткай перамозе над захопнікамі. Набліжаецца дзень нашага вызвалення ад непасільнай рабскай працы, ад здзекаў, голаду і смерці. Я і мае сябры, якія працуюць пад прымусам на нямецкім прадпрыемстве, абяцаем выпускаць непрыгодную прадукцыю, шкодзіць немцам, чым толькі можна» (Белостокская правда 1944).

У гады вайны сфера маладзёжнай палітыкі ў акупіраванай Беларусі стала арэнай жорсткай ідэйнай барацьбы паміж прэсай калабарацыяністаў і савецкімі выданнямі, што выходзілі ў падполлі і зонах дзейнасці партызанскіх злучэнняў. Нацысцкая прапаганда імкнулася схіліць на свой бок падлеткаў і моладзь з дапамогай СБМ, атруціць падрастаючае пакаленне цемрашальскімі ідэямі «новага парадку», але наступальны характар, патрыятычны напал і выдатныя публіцыстычныя якасці матэрыялаў савецкага друку карэнным чынам змянілі спланаваны ворагам ход падзей. Выкрываючы бесчалавечную сутнасць «новага парадку», злачынствы гітлераўцаў супраць мірных жыхароў, дзяцей і падлеткаў, беларускія публіцысты паказвалі сапраўдны твар захопнікаў, зрабілі ўсё магчымае, каб развеяць міф аб светлай будучыні беларусаў пад нямецкім каваным ботам. З дапамогай патрыятычна настроеных жыхароў акупіраваных тэрыторый, большасць з якіх складалі маладыя людзі да 30-35 гадоў, друкаванае слова беларускай публіцыстыкі пранікала ў самыя недаступныя месцы - гарады, варожыя гарнізоны, на нямецкія прадпрыемствы, каб стаць магутнай прапагандысцкай зброяй, якой было па сілах не толькі ўзяць верх над акупацыйнымі выданнямі, пацярпеўшымі палітычнае банкруцтва, але і далучыць да змагання з ворагам дзесяткі тысяч новых барацьбітоў, надаць антыфашыскай барацьбе ў Беларусі сапраўды ўсенародны характар.

ЛІТАРАТУРА


Беларуска моладзь арганізавалася // Беларуская газэта. 1943. 26 чэрв.

В. Гитлеровская «любовь» к детям // За Советскую Родину. 1943. 3 апр.

В. И-ов. В тисках смерти // Партизанская правда. 1944. 15 апр.

Вярбоўка ў... палон // Віцебскі рабочы. 1942. 7 чэрв.

Забойцы дзяцей // За свабодную Беларусь. 1942. 12 кастр.

Ивлев И.А., Юденков А.Ф. Оружием контрпропаганды: Сов. пропаганда среди населения оккупир. территории СССР, 1941-1944 гг. М., 1988.

Каваленя А. Дзейнасць калабарацыянісцкіх саюзаў моладзі на акупаванай фашыстамі тэрыторыі Беларусі (1943-1944) // Гістарычная навука і адукацыя ў Рэспубліцы Беларусь: стан і перспектывы развіцця. Мн., 1999. С. 187-190.

Казлоўскі У. Вітаем нашу моладзь // Беларуская газэта. 1943. 22 чэрв.

Колас Я. Здраднікі // Савецкая Беларусь. 1943. 24 крас.

Мы заклікаем беларускую моладзь // Беларуская газэта. 1943. 22 чэрв.

Открытие детского дома Союзом борьбы против большевизма // Речь. 1944. 12 апр.

Партизан Сашка. Мсти, белорус! // Калгасная праўда. 1943. 11 июня.

Прохов Т. Победа близка // Белостокская правда. 1944. 23 мая.

Смерць і пракляцце дзетазабойцам! // Раздавім фашысцкую гадзіну. 1942. Май. № 42.

Статут арганізацыі моладзі «Саюз Беларускае Моладзі» // Беларуская газэта. 1943. 22 чэрв.

Туронак Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Мн., 1993.

Хухлындина Л. Роль подпольной печати в разоблачении «Союза белорусской молодежи» и Белорусской центральной рады // Великая Победа: итоги и уроки. Тезисы межвузовской науч.-практ. конф. Мн., 1989. С. 65-67.

Пастуліў у рэдакцыю 09.06.05.

*Руслан Вячаслававіч Ананьеў* - карэспандэнт «Народнай газеты».
*Пётр Лявонцьевіч Дарашчонак* - кандыдат філалагічных навук, дацэнт, загадчык кафедры гісторыі журналістыкі і літаратуры.

*Н.А. ЗУБЧОНАК*

# ГАЗЕТА «НАРОДНЫ МСЦІВЕЦ» - ВЫДАННЕ СЛУЦКАГА РК КП(б)Б У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Анализируется содержание номеров слуцкой подпольной газеты «Народны мсцівец» в годы Великой Отечественной войны. Рассказывается о деятельности ее редакции по освещению борьбы партизан Случчины с немецко-фашистскими захватчиками.

The article considers the contents of Slutsk underground newspaper «Narodny Mstivets», it tells about the activity of its editorial staff covering the history of the fight of partisans in Slutsk region against fascist invaders in the years of the Great Patriotic War.

Партызанскі рух на поўдні Міншчыны хутка пашыраўся з вясны 1942 г., павялічваўся прыток патрыётаў у рады народных мсціўцаў. Вялікую ролю ва ўзмацненні масава-палітычнай работы адыгрывалі перыядычныя выданні, што выходзілі ў зоне дзейнасці партызанскіх злучэнняў. З 1 студзеня 1943 г. выдавалася газета «Патриот Родины» (орган міжраённага камітэта РК КП(б)), якая ўплывала на Капыльскі, Слуцкі і Уздзенскі раёны. Вясной 1943 г. пачала выходзіць газета «Сталінец» - выданне Грэскага падпольнага райкома партыі. А пасля стварэння ў студзені 1943 г. партызанскай брыгады № 64 імя Чкалава, якая была замацавана за Слуцкім раёнам у якасці арганізатара партызанскага руху і масава-палітычнай работы сярод насельніцтва, быў наладжаны выпуск выдання Слуцкага райкома партыі «Народны мсцівец». Дзейнасць гэтай газеты дагэтуль мала даследавана, нягледзячы на тое, што яе рэдактарам з'яўляўся Мікалай Еўкавіч Дастанка, які ў пасляваенны час абараніў кандыдацкую дысертацыю, працаваў на факультэце журналістыкі БДУ, быў заснавальнікам і першым загадчыкам кафедры радыё і тэлебачання.

Першы нумар «Народнага мсціўца» ўбачыў свет 1 красавіка 1943 г., але яшчэ раней у партызанскай брыгадзе Nq 64 з'явілася доўгачаканая лістоўка. «Шрыфт для стварэння партызанскай друкарні мне ўдалося вывезці з Любані з дапамогай падпольшчыкаў - дырэктара Любанскай друкарні Паўла Свірыдава і калгасніка Купрыяна Семянені, - пісаў у 1958 г. на старонках "Чырвонай змены" М.Е. Дастанка. - Як цяпер, помніцца, з якой невыказнай радасцю сустрэлі партызаны сваю першую друкаваную лістоўку» (Дастанка 1958, 3). Лістоўка пад назвай «Весткі з фронту» была выпушчана ў навагоднюю ноч 1943 г. і паведамляла аб выніках шасцітыднёвых баёў з вермахтам на подступах да Сталінграда. Лістоўкі шырока распаўсюджваліся на Любаншчыне і Случчыне, іх чакалі з прагнасцю і зачытвалі да дзірак, нягледзячы на тое, што за знойдзены пры вобыску аркуш паперы з заклікамі ці адозвамі гітлераўцы каралі людзей смерцю. У час сумесных аперацый партызаны, здаралася, наладжвалі абмен: 5-10 патронаў за свежую лістоўку.

Вясной 1943 г. жыхары Случчыны і партызаны мясцовых атрадаў пачалі атрымліваць газету «Народны мсцівец» - орган Слуцкага падпольнага РК КП(б)Б. 14 красавіка 1943 г., праз два тыдні пасля выхаду першага нумара, на пасяджэнні Слуцкага падпольнага райкома партыі быў зацверджаны склад рэдакцыі. Рэдактарам прызначылі Мікалая Еўкавіча Дастанку, у склад рэдкалегіі ўвайшлі Пётр Дзям'янавіч Локцеў і Іван Васільевіч Куляшоў (НА РБ. Ф. 4). Ва ўспамінах аб першых кроках газеты-партызанкі Мікалай Еўкавіч пісаў: «Спачатку газету "Народны мсцівец" мы выпускалі ўдвух з Іванам Куляшовым... Пачынаючы з мая 1943 года, у нас быў поўны штат работнікаў рэдакцыі і друкарні: прыйшоў у рэдакцыю настаўнік Іван Хатэнка, а потым узялі літработнікам партызана Віктара Плешавеню... У друкарні працавалі наборшчыкамі камсамолка Люба